# МЕРАПРЫЕМСТВЫ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ ТЭМАТЫКІ Ў АНЛАЙН-ФАРМАЦЕ – ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК ВЫХАВАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

І.П. ПАТАПОВІЧ
*Прыватная ўстанова адукацыі*
*«Баранавіцкі эканоміка-юрыдычны каледж»*

У артыкуле канстатуецца актуальнасць праблемы фарміравання патрыятызму навучэнцаў каледжа, разгледжаны вынікі сацыялагічнага даследавання «Роля і значэнне сеткі Інтэрнэт для вучнёўскай моладзі», апісаны ўмовы арганізацыі культурна-масавых мерапрыемстваў ў анлайн-фармаце. У якасці вынікаў прадстаўлены станоўчыя высновы выкарыстання прамога эфіру ў сацыяльнай сетцы «Instagram» для правядзення мерапрыемстваў грамадзянска-патрыятычнай тэматыкі.

Адным з прыярытэтных напрамкаў станаўлення сучаснага грамадства з'яўляецца выхаванне моладзі. Патрыятычнае выхаванне – адзін з асноўных накірункаў выхаваўчай сістэмы ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Да пытанняў фарміравання светапогляду, грамадзянскіх і патрыятычных якасцей падрастаючага пакалення звернута пільная ўвага як дзяржаўных інстытутаў, так і навукова-педагагічнай грамадскасці. Ад узроўня сфарміраванасці патрыятызму моладзі, ад яе грамадзянскай адказнасці, сацыяльна-палітычнай актыўнасці ў многім залежаць перспектывы развіцця беларускага грамадства.

Для станаўлення жыццёвай пазіцыі, фарміравання грамадзянска-патрыятычнай культуры асобы юнацкі перыяд з'яўляецца аптымальным, паколькі маладыя людзі пачынаюць выступаць у ролі паўнавартасных суб'ектаў сацыяльна значнай дзейнасці патрыятычнай накіраванасці. У той жа час, старэйшы падлеткавы ўзрост – складаны і супярэчлівы. Крытычнасць навучэнцаў, часам перарастае ў бескампрамісны нігілізм, што праяўляецца ў адмоўным стаўленні да многіх фактаў рэчаіснасці. Заўважана, што ў пэўнай часткі вучнёўскай моладзі адбываецца дэфармацыя патрыятычнага пачуцця: навучэнцы лёгка разважаюць над пытаннямі патрыятызму, але патрыятызм як сістэму ведаў, каштоўнасцей і дзеянняў асобы ўсведамляюць фрагментарна, часам прымітыўна. Улічваючы гэта, сістэма выхавання, якая мае трывалыя, правераныя часам традыцыі, патрабуе ўдасканалення.

Пры фарміраванні патрыятычных каштоўнасцей трэба памятаць, што патрыёта можна выхаваць толькі ў працэсе актыўнай творчай адукацыйнай дзейнасці. Цэласнасць педагагічнага працэсу накіроўвае вектар змяненняў і нaваўвядзенняў і ў сферу выхаваўчай дзейнасці. Ва ўмовах прафесійнай адукацыі інавацыйная выхаваўчая сістэма ўяўляе сабой такі спосаб арганізацыі жыццядзейнасці, які прадугледжвае ўпарадкаванасць дыдактычнага і выхаваўчага працэсаў, іх узаемапранікненне ў адпаведнасці з прынятай педагагічнай ідэяй, удасканаленне і змяненне характару сувязяў паміж кампанентамі сістэмы [1, с. 27]. Такім чынам, інавацыйныя выхаваўчыя тэхналогіі могуць не толькі разнастаіць змест выхаваўчай

работы, але і адкрыць новыя магчымасці развіцця творчага патэнцыялу, камунікатыўных навыкаў, ініцыятыўнасці навучэнцаў, і, у цэлым, спрыяць дамінiраванню сацыяльна значных матываў у вучэбнай, прафесійнай дзейнасці.

Уласная практыка аўтара сведчыць, каб выхаваць патрыёта-грамадзяніна, неабходна выкарыстоўваць сістэмныя і доўгатэрміновыя арганізацыйныя формы працы, цікавыя для навучэнцаў. Інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі прадастаўляюць шырокія магчымасці іх прымянення ў выхаваўчай рабоце. Формы выхаваўчага працэсу могуць быць рэалізаваны анлайн і дыстанцыйна: ад анкетавання пры дапамозе інструментаў «Google» да відэаканферэнцый у прамым эфіры.

Паводле дадзеных сацыялагічнага даследавання «Роля і значэнне сеткі Інтэрнэт для вучнёўскай моладзі», праведзенага ў форме анкетавання сярод навучэнцаў Баранавіцкага эканоміка-юрыдычнага каледжа, 97,5 % апытаных карыстаюцца Інтэрнэтам некалькі разоў на дзень, 2 % – адзін раз на дзень і толькі 0,5 % навучэнцаў выкарыстоўваюць глабальную сетку 2–3 разы на тыдзень. Лічбы наглядна паказваюць, наколькі Інтэрнэт запатрабаваны падлеткамі.

Мы можам канстатаваць, што ўсе навучэнцы каледжа зарэгістраваны ў пэўных сацыяльных сетках: маюць акаўнт у «Instagram» (93 %), большая палова зарэгістравана ў «Telegram» (87%). Практычна кожны трэці мае ўліковы запіс у «ВКонтакте» (37%), «Facebook» (24%), «Аднакласнікі» (12 %) і інш. Можна зрабіць выснову, што сацыяльныя сеткі займаюць значнае месца ў жыцці падлеткаў. Няма ніводнага навучэнца, які б не выкарыстоўваў іх.

Улічваючы функцыі сацыяльных сетак, была праведзена апрабацыя набору інструментаў сацыяльнай сеткі «Instagram»: прамы эфір як фармат для правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў грамадзянска-патрыятычнай тэматыкі з навучэнцамі Баранавіцкага эканоміка-юрыдычнага каледжа.

Прамы эфір у сацыяльных сетках – відэа, якое транслюецца ў рэальным часе. Прамы эфір дазваляе вядучаму «наўпрост» весці тэматычную гутарку з гледачамі, дае магчымасць перадаваць эмоцыі і, што асабліва важна, глядач, нават прысутнічаючы аддалена, адчувае сябе ўдзельнікам мерапрыемства, мае магчымасць камунікаваць з дапамогай асаблівых сімвалаў-эмодзі, задаваць пытанні. Адзначана, што анлайн-фармат мерапрыемства ў сацыяльных сетках дазваляе ахапіць значную колькасць навучэнцаў, выкладчыкаў і гасцей.

Педагогам-арганізатарам і навучэнцамі калледжа была арганізавана серыя прамых відэатрансляцый: урок мужнасці «Гонар за Беларусь. На варце нацыянальнай бяспекі і суверэнітэту», круглы стол «Ганаровая місія быць грамадзянінам сваёй краіны» на канале каледжа ў сетцы «Instagram» і дадаткова ў «YouTub». Да Дня абаронцаў Айчыны, па творчай ініцыятыве навучэнцаў, было падрыхтавана тэматычнае відэаінтэрв’ю з навучэнцамі і педагогамі ў прамым эфіры сацыяльнай сеткі. Падчас віртуальнай экскурсіі «Гарады-героі Беларусі» навучэнцы рэгулярна выходзілі ў прамы эфір у «Instagram» са здымачнай пляцоўкі. Такім чынам, атрымалася сумясціць прамы эфір і відэапрэзентацыю.

Прыймальна нашаму даследаванню, важным з’яўляецца тое, што мерапрыемствы грамадзянска-патрыятычнай тэматыкі ў анлайн-фармаце маюць сваю спецыфіку арганізацыі. Перш чым праводзіць канкрэтнае мерапрыемства анлайн,

трэба разумець наколькі гэты фармат «справіцца» з пастаўленымі задачамі ці ў поўнай ступені будзе раскрыта тэма.

Каб эфектыўна правесці культурна-масавае мерапрыемства ў анлайн-фармаце, неабходна напісаць сцэнарый, арганізаваць эфір, наладзіць трансляцыю. Планаванне мерапрыемства ў прамым эфіры варта пачынаць з таго, каб пабудаваць канцэпцыю, максімальна адаптаваную да таго, што аўдыторыя будзе задзейнічана праз смартфоны, планшэты, камп'ютары [2].

Акрамя тэхнічных прылад і навыкаў, неабходна выкарыстоўваць некаторыя тэхналогіі і інтэрнэт-маркетынгу, у прыватнасці, надаць сур'ёзную ўвагу інфарміраванню аб мерапрыемстве [3]. Абавязковая ўмова – наяўнасць уласнага акаўнта навучальнай установы ў абранай сацыяльнай сетцы, дзе плануецца эфір і пэўнай колькасці падпісчыкаў, паколькі менавіта яны атрымаюць аўтаматычнае апавяшчэнне аб правядзенні мерапрыемства. Трэба вырашыць задачу як мага большага ахопу навучэнцаў і гасцей. І не толькі ахапіць, але і заахвоціць іх да актыўнага ўдзелу. Бо толькі тады прамы эфір будзе па-сапраўднаму цікавы для навучэнцаў, г.зн. прадуктыўны.

Паколькі прамы эфір мае сваю спецыфіку: гледачы не адразу, а паступова падключаюцца да мерапрыемства, могуць пакінуць канал па розных прычынах, у тым ліку і тэхнічных, то неабходна ўсім жадаючым прадставіць магчымасць паглядзець трансляцыю ў запісе. Зрабіўшы добры мантаж, відэа можна размясціць на афіцыйнай старонцы ўстановы адукацыі ў сацыяльных сетках, сайце. Таксама магчыма зрабіць тэматычны фільм, выкарыстоўваючы відэаматэрыялы з мерапрыемства.

У кантэксце нашага даследавання практыка правядзення мерапрыемстваў грамадзянска-патрыятычнай тэматыкі ў анлайн-фармаце дала станоўчы вынік:

- удасканальваюцца ўмовы для раскрыцця і рэалізацыі творчага патэнцыялу навучэнцаў каледжа, фарміравання ў іх духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры і патрыятызму;
- павышаюцца інфармацыйная культура навучэнцаў, іх узровень валодання інфармацыйнымі тэхналогіямі; назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя ўдасканалення камунікатыўнай культуры навучэнцаў;
- прадуктыўна развіваецца самакіраванне навучэнцаў; прасочваецца павелічэнне колькасці навучэнцаў, якія жадаюць прымаць непасрэдны ўдзел у мерапрыемствах анлайн-фармату;
- павышаецца ўзровень прафесійнай інавацыйнай кампетэнтнасці педагогаў каледжа.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Шадриков, В.Д. Новая модель специалиста: инновационная подготовка и компетентностный подход / Высшее образование сегодня. 2004, – С. 26–31.

2. Как сделать и провести прямой эфир в Инстаграм: самое полное руководство [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://postium.ru/pryamoj-efir-v-instagrame-kak-zapustit-i-kak-smotret. – Дата доступа – 12.05.2023

3. Акулич, М.В. Ивент-маркетинг / М.В. Акулич. – Екатеринбург : Издательские решения, 2020. – 188 с.